Шчасцем забыты паэт, як і дзесяткі ягоных вялікіх папярэднікаў, просіць у долі кахання, аднак у роспачы чуе толькі журботны плач раяля. Герой песняў Л. Дранько-Майсюка уздымаецца ад рэальнага свету, чым працягвае традыцыі ўсхвалення кахання, пачатыя ў Эладзе (невыпадкова паэт з кампазітарам П. Яроменкам стварылі аднайменную песню), Францыі. Менавіта таму ў ягоных творах падобнага плану адпаведны настрой ставарае віно, звыклыя дэталі інтэрьера, амаль рэальны пах кветак.

Апошнія адыгрываюць выключную ролю ў лірыцы Л. Дранько-Майсюка наогул і ў песеннай у прыватнасці. Так, у голасе каханай для яго квітнеюць астры, у ружу ён хоча завіць дыханне адзінай. Сімвалізацыя кветак дазваляе яму ўславіць розныя поры кахання, калі на змену кахання руж (юнацкаму) прыходзіць “Верасень хрызантэмны”:

Напілася хрызантэма вераснёвае красы,
Вераснёвага блакіту, вераснёвае красы,
Вераснёвыя прасторы з вераснёвага акна,
А найболей, а найболей – вераснёвага віна.

Шматлікія паўторы з самымі разнастайнымі варыяцыямі вызначальнага слова і яго асацыятыўнай сістэмай выразна сведчаць, што гэта пачуццё, сакральнае ў цэлым для аўтара, становіцца больш сціплым, спакойным (невыпадкова ўзнікае асацыяцыя з далёкай Японіяй). Аднак яно не менш бурнае ўнутры, бо і восеньскія хрызантэмы валодаюць адметнай прыгажосцю. Якраз сціплая кветачка і дазваляе аўтару ад макракосмасу праблем чалавецтва перакінуць мосцік да не менш велічнага сусвету малой радзімы. У эсэ “Стомленасць Парыжам” Л. Дранько-Майсюк згадваў: “Невыпадкова ў квяцістых давыд-гарадоцкіх гародах я заўсёды бачу ўсе адценні французскага імпрэсіянізму. Вось чаму да дзікай астры Мацiса далучу кветкі, прыручаныя давыд-гарадоцкімі майстрамі”. Пра радзіму паэту заўсёды нагадваюць “Сон лілей”, “Аксамiткі”, “Вязе мой, вязу”, нават “Бульба”.

Зразумела, што не мог шчыры і вясёлы хлопец з Гарыні забыцца і на выключна родныя традыцыі. Вось чаму ў стылі традыцыйных беларускіх пераплясаў гучыць ягоная "Полька беларуская”, якая як бы яшчэ раз заяўляе свету – “Сцеражыся, беларус гуляе”. Сарамліва-эратычна, калі можна так сказаць, гучыць песня ў фальклорным стылі пра ваяводу маладога (“Што няма мягчэй нідзе, як ляжаць на лебядзе; паглядзець, як мы ляжым з ваяводам маладым”). У гэтым жа рэчышчы надзвычай добра прагучалі “Беларускае танга”, “Цыганка”. На наш погляд, фальклорны струмень яшчэ не да канца ўзбагаціў песенную лірыку Л. Дранько-Майсюка, менавіта тут яшчэ чакаюцца сапраўдныя знаходкі і адкрыцці.

## Спіс літаратуры

1 Навуменка, І. Я. Янка Купала / І. Я.Навуменка – Мн. : Вышэйш. школа, 1980. – 205 с.

УДК 821.161.3.09

Л. М. ГРЫЦУК
(г. Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна)

## У НОВЫХ АБСТАВІНАХ: СВОЕАДМЕТНАСЦЬ ЭЛЕГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ ЯЗЭПА ПУШЧЫ

Артыкул прысвечаны адметнасці элегічнай спадчыны Язэпа Пушчы. Разглядаюцца элегіі-разважанні, элегіі смутку, жалю, медытатыўныя элегіі. Робіцца спроба класіфікаваць элегіі паэта, суаднесці іх з класічнымі ўзорамі антычнай лірыкі.

Нялёгкі лёс напаткаў пісьменнікаў, якія пісалі ў пачатку XX ст. Язэп Пушча, як і Максім Багдановіч, Янка Купала, Алесь Гарун, Якуб Колас паспыталі на сабе змены ў грамадскім ладзе, перажывалі незадаволенасць новай рэчаіснасцю. Творы гэтых пісьменнікаў вызначаюцца сумам, самотай, сентыментальнасцю, расчуленасцю. У пачатку XX ст, у эпоху новага беларускага Адраджэння, у беларускай літаратуры элегія заняла вядучыя пазіцыі.

У творчасці Язэпа Пушчы можна выдзеліць некалькі перыядаў. Першы перыяд – 1922–1926 гг. – час, калі паэт стварае ўрачыстую песню, прысвечаную сацыялістычнаму грамадству. Язэп Пушча стаіць ля вытокаў літаратурнага аб'яднання "Маладняк", імкнецца пісаць як Сяргей Ясенін, эксперыментуе ў вобразна-выяўленчым плане. Героем яго твораў выступае "сын вёскі", дарэчы, як і сам паэт. Аднак паэт ужо адчувае складанасць жыцця, у творах з'яўляецца трывога. Язэп Пушча звяртаецца да патаемных глыбінь чалавечай душы:

Смутак слязой адцвітае на скронях...
Дайце мне, дайце мне новых настрояў!
<...> Шчодра рассыпаны росы на клёнах, –
Смутак слязой адцвітае на скронях [1, с. 60].

Перыяд з 1926 па 1927 гг. можна назваць другім этапам творчасці. У паэзіі Язэпа Пушчы замест радасных, узнёслых пачуццяў пачынаюць гучаць матывы адзіноцтва, тугі, роспачы, недаверу. Лірыка мае філасофскі ўхіл, на што паказваюць назвы зборнікаў гэтага часу – "Vita" і "Дні вясны". Героем твораў становіцца сын Зямлі. Рамантыка сустракаецца з рэальнасцю, у выніку чаго, як заўважаў яшчэ ў XVII ст. іспанскі паэт Луіс дэ Гонгара, адбываецца трагедыя. Калі ў 1927 годзе Язэп Плашчынскі (сапраўднае прозвішча паэта) пераводзіцца вучыцца ў Ленінград, радасны, святочны пафас выцясняецца трагедыйнасцю. Паэт дзівіцца красе будынкаў, дабрабыту ленінградцаў (цыкл "Асеннія песні") і адчувае боль ад таго, што добрыя, шчырыя, працавітыя беларусы пазбаўлены такога хараства ў жыцці. Паэт нават думае пра самагубства. Дысгармонія ў душы нарадзіла верш "Заплаканы вечар", у якім наша краіна аказваецца распятай на крыжы, пакутуе.

Трэці перыяд (1927–1930 гг.) адзначаецца пераходам ад оды да элегіі. З'яўляюцца сімвалы няшчасця, бяды, гора. Таму менавіта гэты перыяд будзе ў цэнтры нашай увагі ў артыкуле, мы разглядаем творы, напісаныя паэтам у другой палове 30-х гадоў да яго высылкі з Беларусі. Даследчыкі творчасці Язэпа Пушчы адзначаюць, што ў гэты час "змест паэзіі Пушчы <...> яшчэ выразней набывае рысы класічнай суразмернасці, гармоніі" [2, с. 567].

Лірыка часоў знаходжання паэта ў Расіі і пасляваенныя творы вызначаюцца аптымістычным настроем, элегічныя творы гэтага часу хоць і трагічныя, але больш эмацыянальныя, меладраматычныя.

Жанр элегіі вядомы яшчэ з антычных часоў. Спачатку элегіямі называлі сумныя вершы, напісаныя для прачытання над нябожчыкам у час пахавання. Пазней жанравыя межы пашырыліся і элегіямі сталі называць вершы наступнай тэматыкі: элегіі-разважанні, элегіі смутку, элегіі жалю, медытатыўныя элегіі, сацыяльна-грамадзянскія, элегіі на тэму прыроды, псіхалагічныя, філасофскія элегіі. Старажытная элегія характарызавалася адзнакамі лірычнага і эпічнага родаў літаратуры, знаходзілася на памежжы апісальнасці і перажывання. Яе адметнымі рысамі былі невялікі памер, эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць, сувязь з жыццёвымі рэаліямі і дыдактызм. Сюжэты самых старажытных элегій грунтаваліся на міфалагічных матывах і вобразах згодна з традыцыямі гераічнага эпасу. У элегіі паэт самавыяўляецца, аповед, як і ў лірыцы ў цэлым, вядзецца ў ёй у цяперашнім часе. Але да свабоднага палёту думак майстры старажытных элегій не ўздымаліся. Сюжэты элегій, у адрозненне ад эпапейных твораў,

не ахоплівалі шырока карціны жыцця народаў і велічныя здарэнні, а грунтаваліся на асобных падзеях, у якіх аўтары ці іх блізкае акружэнне прымалі непасрэдны ўдзел.

У пачатку XX стагоддзя ў элегіях адлюстроўваецца настрой паэта, яго перажыванні, выкліканыя не толькі праблемамі ў асабістым жыцці, а перш за ўсё – нацыянальнымі праблемамі, болем за цяжкі лёс грамадства ў цэлым. Беларуская элегія выступіла ў гэты час ва ўсіх разнавіднасцях, якія былі вядомыя яшчэ з часоў антычнасці. У 20-я гады XX стагоддзя элегічным пафасам былі пазначаны многія творы Я. Пушчы, Т. Кляшторнага, А. Моркаўкі, С. Дарожнага, і іншых паэтаў.

У творчасці Язэпа Пушчы можна вызначыць элегіі медытатыўныя (ці апісальныя), філасофскія, сацыяльна-грамадзянскія элегіі, элегіі-разважанні, элегіі смутку, жалю.

У філасофскай элегіі “Праплюскочуць гады, бы вада” паэт разважае пра сэнс жыцця. Самым страшным для яго будзе згубіць “свой бярозавы край”! Замест бярозавага гаю “ногі завязнуць ў пясках”. Цікава, што адчуванне трагедыі – развітання з радзімай – з’явілася ў паэта яшчэ за некалькі гадоў да высылкі з Беларусі (верш “Праплюскочуць гады, бы вада” датуецца 1926 годам). Лірычны герой застаецца адзін у чужой краіне: “не спаткаю сваіх там сясцёр”. Сімвалічнымі з’яўляюцца словы “завію дзень апошні ў вянок”. Вянок – гэта быццам кола, ў якога няма ні пачатку, ні канца. Таму ў чытача з’яўляецца надзея, што лірычны герой не згіне, не згубіцца, ён павінен жыць вечна. Жыць са сваёю тугой. Паэт прадказаў не толькі сваю будучыню, але і трагічную пару ў лёсе беларускага грамадства.

Асэнсаванне таго, что жыццё ўжо прайшло, але прайшло не так, як павінна было быць, выразна адчуваецца ў філасофскай элегіі “Зялёны шум лясны”: “Мне сёння сняцца сны, // Што я другі, не той...” [1, с. 42]. Адчуванне неабходнасці перамен прыходзіць толькі ў сталым узросце. У вершы можна прасачыць увесь жыццёвы шлях чалавека, паглядзець, як з узростам мяняюцца яго думкі і настрой. У маладосці “зялёны шум лясны // Змятае сум з кустоў”. З цягам часу адбываюцца розныя падзеі, важна не страціць выбраны шлях, не “заблудзіцца”, таму што хочацца жыць: “І хочацца ўсё жыць, // На бляск зары глядзець” [1, с. 42]. У ранні перыяд творчасці раніца здавалася паэту светлай, сталае жыццё меркавалася такім жа светлым, але жыццё прайшло, а святла няма.

Медытатыўная лірыка перадае перажыванні, меркаванні паэта пра жыццё смерць, пра каханне, сяброўства. Медытацыя – гэта разумовае дзеянне, мэта якога прывесці псіхіку чалавека ў стан паглыбленасці і засяроджанасці. Медытацыя суправаджаецца адсутнасцю эмацыянальных праяўленняў, адмежаванасцю ад навакольнага асяроддзя.

Лірычныя выказванні заўсёды эмацыянальныя, і да таго ж у іх надзвычай актыўна праяўляецца медытатыўны пачатак (слова “медытацыя” паходзіць з лацінскай мовы і азначае разважанне). “Паэт-лірык ацэньвае асабістыя пачуцці, тым самым дазваляючы чытачу глыбей зазірнуць у свет сваіх перажыванняў. Так нараджаецца лірыка пачуццёвай рэфлексіі” [3, с. 67]. Бывае, што паэт разважае пра сэнс жыцця, выступае ў якасці філосафа, мысляра. І тады з’яўляецца “паэзія думкі” (азначэнне А. С. Пушкіна, затым падтрыманае В.Р.Бялінскім).

У вершы “Здаецца...”, які датуецца 1926 годам, паэт імкнецца зразумець тайну ўсяго існага, седзячы адзін у пакоі:

Здаецца, што глядзеў бы вечна й вечна
Ў таемна-існае сталеццяў дно.
Люблю, калі гараць ды лямпа з свечкай,
Калі іх свет зліваецца ў адно [1, с. 39].

Свечка – гэта заўсёды фантазія, гэта паглыбленне ў свет па-за *ratio*, гэта і адчуванне містычнага, якое час ад часу “дазваляе” чалавеку даведацца пра тайны Сусвету. Пытанне толькі ў тым, ці лепей стане чалавеку ад таго, што ён зведаў пра будучыню?

У элегіі-разважанні “З табой я спаткаўся учора” (1926 г.) паэт дакарае сябе за тое,

што пакахаў. Ён не радуецца гэтаму светламу пачуццю, а адчувае тугу. Аднак, туга яшчэ не вельмі моцная, як ў вершы "Каханне, залатое каханне" (1926 г.), у якім паэт зноў звяртаецца да Стасі, якая вырасла на Случчыне. Туга нарастае, паэт прызнаецца, што пакахаў сірату Стасю за тое, што і сам "у самоце узрос". Каханне цяжка знайсці, "цяжка шчасце ў дарозе налучыць" [1, с. 52], каханне – гэта нешта неканкрэтнае, таемнае: "Я спаткаў у даліне два цені, // А таксама таемнасці здань..." [1, с. 52]. Яшчэ ў адным вершы, прысвечаным Стасі, які датуецца 1929 годам (верш "Стасі"), чытач ужо не мае надзеі на тое, што паэт і Стася будуць разам, адчуванне трагедыі набліжаецца: "Ці ўспамінаеш ты сягоння, Стася, // Пра гэтую пару ў сваёй радні?" [1, с. 86].

Сацыяльна-грамадзянскія элегіі адметныя тым, што ў іх адсутнічаюць урбаністычныя тэндэнцыі. Сацыяльнае гучанне твораў ажыццяўляецца пры дапамозе апісання прыроды. Язэп Пушча малюе неспакойны душэўны стан беларусаў:

Вераснёвыя смуглыя колеры
Ў задуменні засмучаным вянуць;
Ў задуменні бярозы пакорныя
Атрусаюць журбу на паляну [1, с. 71] ("Зашумелі лісты").

Паэт супрацьпастаўляе раніцу восені, сонцу – туман, "вечар смуглы": "Таемнасць-здань тут сніцца // Пад скрып і рып калёс. // Туман ў даліне ніцай // Губляе перлы рос" [1, с. 77] ("Ў прасторы зоры..."). Смутак і самота аўтара ўвасабляецца ў вобразе восені з пажоўклым ападаючым лісцем. Сваю блізкасць да прыроды Язэп Пушча падкрэслівае ў вершы "Ліст да паэтаў": "Мы блізкія сёння людзям і прыродзе, – // Ў нас пульсы крывёю гарачаю б'юцца" [1, с. 73].

"Лісты да сабакі", як і многія іншыя творы паэта, у якіх адбіліся песімістычныя і роспачныя настроі, з'явіліся як вынік часовай страты ім гістарычнай перспектывы, неразумення ўсёй складанасці працэсаў усталявання новага грамадскага ладу. І гэтыя змены прывялі не да светлай будучыні, а да змрочных часоў:

Я ведаю – цяпер у вас там восень
І ночы чорныя жуду калышуць.
Вятры лісты ажоўклыя разносяць
І намятаюць гурбамі ў зацішак [1, с. 342].

У элегіі "Лісты да сабакі" аўтарам робіцца спроба пераацэнкі жыццёвых каштоўнасцей. Паэт быццам спавядаецца перад намі, давяраючы думку аб немагчымасці мець права на свабоду выказвання, на самастойнасць мыслення ў грамадстве. Паэта не разумеюць, і ён самотна блукае, шукаючы сабе прытулак:

Ты позняй восенню ў палёх глухіх брадзяжыў,
Знайсці прыстанішча сабе ніяк не мог.
Імгліліся жудою хмары сыпкай сажы,
А ты пад імі выў і грыз балотны мох [1, с. 344].

Зразумець душэўны боль можа толькі духоўна блізкі чалавек:

Ніводзін дзень не ведаў ласкавай пагоды, –
За навальніцай навальніца смерці йшла.
Ніхто з людзей не мог адчуць наш боль трагічны;
Была страшная зяб – рыпелі косці дрэў,
Карэнні іхніх ног былі ў крыві крынічнай.
Выгнання дзень, бы злодзей, краўся па двары [1, с. 345].

Элегіі-жальбы можна вылучыць у групе сацыяльна-грамадскіх па змесце элегій, што ўзыходзяць да сярэдневяковых галашэнняў па нябожчыку. Смутак Язэпа Пушчы як абавязковая матывацыя элегічнага пафасу быў сведчаннем філасофскай ацэнкі жыцця ў цэлым. Вясковыя матывы вельмі выразна распавядаюць чытачу пра складанае жыццё, калі нават прырода перажывае цяжкасці разам з чалавекам: "шум гонкае хвоі // Навеяў таемнасць і страх", "спламлена кроўю каліна" [1, с. 56] ("Мастак").

У патрыятычнай элегіі "Пад хатай..." публіцыстычны заклік паэта мае мэтай абудзіць беларусаў да перамен. Язэп Пушча шукае новыя шляхі да абуджэння духу суайчыннікаў, але, як раней Максім Багдановіч і Янка Купала, знаходзіць іх у саміх беларусах:

Пад хатай, на прызбе абуялай
Ды грэецца дзень светларусы.
Налівайцеся, гукі цымбалаў,
Уцехай палёў Беларусі! [1, с. 40].

Захаваць незалежны дух, атрымаць самастойнасць краіне дапаможа толькі цвёрдае імкненне народа да гэтага. Народная самабытнасць – вось той стрыжань, які не дазволіць прынізіць і падпарадкаваць беларусаў. Пакуль ёсць таленавітыя людзі, пакуль яны дораць нам свае думкі, афармленыя ў песні, беларусы не згінуць як нацыя. Крыніцай песень для паэта стала родная краіна, ён "ў народзе іх падслухаў сэрцам і душой, // І радасць, вобразаў нязвыклых ў іх знайшоў" [1, с. 89] ("Бальзам жывой вады"). Народныя песні паэту эмацыянальна блізкія, таму што ў іх адлюстроўваецца сутнасць народных уяўленняў пра свет, пра справядлівасць, пра сапраўдныя чалавечыя адносіны. Рытарычнае пытанне "Не ведаю, які мой будзе з імі лёс?" [1, с. 89] прымушае і чытача задумацца над праблемай захавання народных традыцый. Відавочна, што ў плане мастацкіх замалёвак роднай краіны на Язэпа Пушчу паўплывалі традыцыі С. Ясеніна, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча.

Элегіі Язэпа Пушчы, як, напрыклад, і элегіі Максіма Багдановіча прывучалі беларускага чытача да разумення і запазычання мастацкіх каштоўнасцей мінулых часоў. Жанр элегіі дапамагаў беларускім паэтам прывіваць нашай літаратуры новыя якасці: індывідуалізацыю лірычнага пісьма, узмацненне асабістага пачатку ў ім, паглыбленне псіхалагічнага аналізу. Элегіі Язэпа Пушчы адпавядаюць класічным элегіям старажытнасць ў плане зместу, эмацыянальнага настрою твораў, але вершаваны памер антычных элегій (спалучэнне гекзаметра з пентаметрам) паэтам не выкарыстоўваецца.

## Спіс літаратуры


1 Пушча, Я. Сады вятроў : Вершы і паэмы. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 367 с.

2 Мішчанчук, М. Язэп Пушча / М. Мішчанчук // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. Т. 2. – Мінск, 2002. – С. 550–575.

3 Поспелов, Г. Н. Лирика: Среди литературных родов / Г. Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976. – 207 с.



УДК 821.161.1 – 43*Пушкин : 821.161.3 – 43*Богданович



И. Б. АЗАРОВА, И. Г. ЕВТУХОВА
г. Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины


## ЖАНР ПУТЕВЫХ ЗАМЕТОК В ТВОРЧЕСТВЕ А. С. ПУШКИНА И М. БОГДАНОВИЧА

Поиск традиций, аналогий, параллелей, исследование многообразия языковых и художественных средств изображения в пределах жанра путевых заметок на примере творчества А. С. Пушкина и М. Богдановича представляет собой интересную область. Их произведения содержат уникальную познавательную информацию, а индивидуально-авторская манера изложения отличается поразительной осведомленностью писателей в разнообразных вопросах, умение достичь предельной концентрации информации на минимальном текстовом объеме, использование внетекстового комментария и др.